УДК 811.161.3'38

В. А. Кузьміч, дац. (БДТУ, г. Мінск)

# МОЎНАЯ СТЫЛІЗАЦЫЯ ЯК МАСТАЦКІ ПРЫЁМ

Адной з прымет сапраўднага пісьменніцкага майстэрства з'яўляецца ўменне творцы рабіць сваіх літаратурных герояў больш рэальнымі, як мага дакладней перадаць мясцовы, сацыяльны або прафесійны каларыт. Гэта ўменне грунтуецца на тонкім пачуцці мовы і глыбокім разуменні свайго чытача. Яно дапамагае аўтару ствараць непаўторныя і незабыўныя вобразы, якія з літаратуры пераходзяць у масавую культуру і адметным чынам пазначаюць літаратурную постаць, эпоху або месца.

На моўным узроўні гэтаму служыць **стылізацыя** – асаблівая пабудова мастацкага апавядання згодна з характэрнымі рысамі і знешнімі маўленчымі прыметамі пэўнага сацыяльнага асяроддзя, гістарычнай эпохі, літаратурнага напрамку, жанру, індывідуальнай манеры пісьменніка.

Сутнасць стылізацыі ў мэтанакіраваным уключэнні ў мастацкі твор маўленчых сродкаў, характэрных для пэўных эпох, літаратурных тыпаў, іншых стыляў, выбраных аўтарам у якасці аб'екта пераймання (імітацыі).

Прыёму стылізацыі ў сучаснай стылістыцы і літаратуразнаўстве надаецца незаслужана мала ўвагі, нягледзячы на тое што стылізацыя як мастацкае перайманне існуе ў літаратуры яшчэ з часу антычнасці і паэтыкі Адраджэння, калі мастацкае перайманне антычных узораў стала літаратурнай нормай.

Сучасныя даследчыкі толькі нядаўна пачалі звяртаць увагу на гэты стылістычны прыём. Стылізацыя найбольш уласціва мастацкай літаратуры, у меншай ступені – публіцыстыцы.

Найбольш распаўсюджанымі тыпамі моўнай стылізацыі лічацца архаізацыя, дыялектызацыя, сацыяльная стылізацыя, індывідуалізацыя мовы літаратурных персанажаў.

*Архаізацыя, або гістарычная стылізацыя*, – гэта стылістычны прыём, які дапамагае аўтару ўзнавіць пэўную эпоху, яе гістарычны каларыт, надаць мастацкаму твору манументальнасць і пафаснасць. Архаізацыя заснавана на мэтанакіраваным выбары некаторых элементаў мовы пэўнай эпохі. *Дыялектызацыя* – гэта стылістычны прыём, які грунтуецца на ўвядзенні ў літаратурную мову рэгіянальных моўных элементаў. *Сацыяльная стылізацыя* – гэта стылістычны прыём, заснаваны на выкарыстанні элементаў мовы, абмежаванай пэўным сацыяльным асяроддзем (прафесійная лексіка,

жарганізмы, прастамоўная лексіка і г. д.). *Індывідуалізацыя мовы літаратурных персанажаў* – гэта стылістычны сродак, заснаваны на тым, што аўтар прыпісвае сваім літаратурным персанажам такія маўленчыя рысы, якія ператвараюць герояў не толькі ў прадстаўнікоў пэўнай эпохі ці сацыяльнага асяроддзя, але і ў жывыя, індывідуальныя і запамінальныя постаці. Існуе таксама мноства іншых відаў стылізацыі (стылізацыя на літаратурны жанр, алюзія, пародыя і г. д.).

Даследаванне гэтай тэмы ў прымяненні да беларускай стылістыкі ўпершыню праводзілася на грунтоўным узроўні ў межах выкладання дысцыпліны "Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы" у БДТУ. Створаны падручнік "Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы" (аўтары: Кузьміч В. А, Шахаб В. В) атрымаў грыф Міністэрства адукацыі Беларусі, а таксама паслужыў асновай для ўключэння паняцця моўнай стылізацыі ў пазнейшыя сучасныя выданні па стылістыцы, напрыклад, [2, с. 43-45].

Усё гэта сведчыць пра тое, што вывучэнне гэтага стылістычнага прыёма на матэрыяле беларускай мовы з'яўляецца запатрабаваным не толькі для стылістычных даследаванняў, але і для літаратуразнаўства.

Акрамя таго, нельга не адзначыць вялізны культурны патэнцыял стылізацыі як мастацкая з'явы. Менавіта праз стылізацыю ўсталёўваюцца сувязі літаратурнага твора з іншымі творамі, а сам чытач пачынае разумець тэкст у шырэйшым кантэксце (т. зв. інтэртэкстуальнасць). Таму стылізацыя – гэта не толькі мастацкі прыём, але і важны сродак пашырэння культурнага кругагляду і выхавання чытача.

## ЛІТАРАТУРА

1. Багамолава, А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення : вучэб. дапам. / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2012. – 304 с.

2. Кузьміч, В. А. Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі па спец. "Выдавецкая справа" / В. А. Кузьміч, В. В. Шахаб. – Мн.: БДТУ, 2008. – 238 с.